# III Моладзевы лагістычны форум «Будучыня лагістыкі»

**У факультэта маркетынгу і лагістыкі шмат традыцый, і карысныя мерапрыемствы — адна з іх. Вось ужо трэцюю вясну запар ФМК праводзіць форум, прысвечаны ўсім будучым спецыялістам па лагістыцы. Расказваем, што гэта такое і чаму яго варта наведаць.**

**Неабыякавы да лагістыкі? Табе на Форум!**
Лагістычны форум — сапраўдны мастхэў для ўсіх, хто хоча асвоіць мастацтва кіравання транспарціроўкай. Тут можна атрымаць новыя веды і палепшыць практычныя навыкі. Для гэтага ў межах форума праходзяць:
• Алімпіяда «Лагістыка і кіраванне ланцугамі паставак у глабальнай эканоміцы»,
• Бізнес-мітап «Лагістыка сёння і заўтра».

**Актыўнасці Форума**
Алімпіяда — гэта магчымасць праверыць і паглыбіць свае веды ў тэорыі лагістыкі, а таксама адчуць сябе ў ролі сапраўднага спецыяліста. Яна складаецца з трох этапаў:
• Рашэнне кейса (завочна),
• Дыстанцыйнае тэсціраванне,
• Каманднае прадстаўленне праектаў.

Трэба адзначыць, што кейсы, якія студэнты вырашаюць на Алімпіядзе, даюць рэальныя лагістычныя кампаніі. У 2024 годзе свае кейсы для Алімпіяды падалі дзве кампаніі — «Неатэра Логістыкс» і «Неттокс Лоджыстыкс». Такі фармат дазваляе ўдзельнікам зазірнуць у рэальныя бізнес-працэсы і адчуць усю

сур’ёзнасць рашэнняў, прынятых імі. Таксама гэта дае кампаніям шанец заўважыць выбітных навучэнцаў і запрасіць іх на працу.
Бізнес-мітап — гэта сэт карысных лекцый ад сучасных спецыялістаў. На ім можна даведацца пра актуальныя тэндэнцыі ў сферы і пашырыць веды пра прафесію ўвогуле. Азнаёміцца з актуальнай праграмай мітапа можна ніжэй.

Звярніце ўвагу, што рэгістрацыя на бізнес-мітап працягнецца да 15 красавіка. Зарэгістравацца можна па спасылцы.

**Вынік**
Калі вам здаецца, што стаць паспяховым спецыялістам яшчэ да заканчэння ўніверсітэта немагчыма, вам варта наведаць Форум. Менавіта такія мерапрыемствы адкрываюць новыя напрамкі вашага прафесіяналізму і дазваляюць пачаць шлях да кар’ернага росту.